зе, хіміі нанаструктураваных матэрыялаў і іонна-імплантаваных палімераў, фотаэлектрахіміі квантава-размерных неарган. і малекулярных паўправадніkoў.

*Тв.:* Ion-implanted Polymers (разам з У.Б.Аджаевым, І.П.Казловым) // Electrical and Optical Polymer Systems. New York, 1927; Photoelectrochemistry of nanocrystalline aggregates of cyanine dyes on the semiconductor electrodes // Chemical Physics of Nanostructured Semiconductors. The Netherlands, 2003; Математическое моделирование физико-химических процессов. Мн., 2003 (разам з У.Р.Скацецкім, В.І.Яшкіным).

**СЕЛЯМЕ́НЕЎ** Вячаслаў Дзмітрыевіч (н. 6.9.1946, Мінск), бел. гісторык-архівіст. Канд. гіст. н. (1979). Скончыў БДУ (1971). З 1968 у Цэнтр. дзярж. архіве Кастр. рэвалюцыі і сацыяліст. будаўніцтва БССР, з 1977 у Гал. архіўным упраўленні пры СМ БССР, з 1980 нам. дырэктара Цэнтр. дзярж. архіва БССР у Мінску, з 1982 дырэктар Цэнтр. дзярж. архіва Кастр. рэвалюцыі і сацыяліст. будаўніцтва БССР (з 1995 Нац. архіў Рэспублікі Беларусь). Даследуе гісторыю Беларусі з 1917, пытанні архівазнаўства. Адзін з аўтараў кніг «Хроніка Чарнобыльскай трагедыі, 1986—1996 (па дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь)» (1996), «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь» (2002). Адзін са складальнікаў даведнікаў «Адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад БССР» (т. 1, 1985), «Фонды былых архіваў Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 1—2, 1997—98), зб. дакументаў і матэрыялаў «Беларускія остарбайтэры» (т. 1—3, 1996—98), «Азарычы — лагер смерці» (1997), «Нацысцкае золата з Беларусі» (1998), «Заходняя Беларусь. Падзеі і людзі» (т. 1—2, 1998—2002), «Аграрныя пераўтварэнні ў Вілейскай вобласці, 1939—1941 гг.» (2001), «Аграрныя пераўтварэнні ў Маладзечанскай вобласці, 1944—1953 гг.» (2003), «Дакументы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь» (2003). Дзярж. прэмія Беларусі 2002.

*Тв.:* Документальные памятники Советской Белоруссии. Мн., 1990 (разам з М.Ф.Шумейкам); Белпромстройбанк: Страницы истории (1923—1998) Мн., 1998 (разам з К.В.Цыбулькам, М.Е.Капытовым); Архивоведение Беларуси. Ч. 1—2. Мн., 1998 (разам з Шумейкам, К.І.Козакам); Белорусские остарбайтеры: Ист.-аналит. исслед. Мн., 2001 (у сааўт.); Забытые агенты Кремля (разам з В.І.Шымоліным). Мн., 2003.

**СЕМЯНКО́ВА** Галіна Мікалаеўна (н. 2.5.1952, Мінск), бел. вучоны ў галіне малекулярнай біялогіі. Канд. біял. н. (1989), дац. (2002). Скончыла БДУ (1973), дзе працуе з 1977. Навук. працы па вывучэнні механізмаў актывацыі клетак імуннай сістэмы, ролі актыўных форм кіслароду і азоту ў рэгуляцыі функцыян. актыўнасці клетак у норме і пры захворваннях, звязаных з парушэннем імунітэту. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

*Тв.:* Активные формы кислорода и функциональный отклик имунных клеток (разам з С.М.Чаранкевічам) // Фотобиология и мембранная биофизика. Мн., 1999; Investigation of G-CSF-influence on activity of neutrophils of healthy volunteers and oncohaematological patients by the chemiluminiscent method (у сааўт.) // Chemiluminescence at the turn of the milenium. Dresden, 2001. *А.Б.Самаль.*

**СЕН** Амарцья (н. 3.11.1933, Шанцінікетан, Індыя), індыйскі эканаміст. Д-р эканам. н. (1959). Скончыў Калькуцкі і Кембрыджскі (1955) ун-ты. Выкладаў эканоміку ў ВНУ Індыі, Вялікабрытаніі і ЗША: у Джабалпурскім (1956—58), Дэлійскім (1963—71), Оксфардскім (1978—88 і з 1998) і Гарвардскім (1988—98) ун-тах, Лонданскай школе эканомікі (1971—77). У працы «Галеча і голад...» (1981) даследаваў фактары, якія вядуць да беспрацоўя і неэфектыўнасці сістэмы харч. размеркавання, выступае як прыхільнік дапамогі бедным і захавання стабільных цэн на прадукты харчавання. Нобелеўская прэмія па эканоміцы 1998.

*Тв.:* Рус. пер. — Развитие как свобода (отрывок из книги «Развитие как свобода») // Индия. Перспективы. 2000. № 1. *В.У.Адзярыха.*

**СЕ́РБІЯ І ЧАРНАГО́РЫЯ** (Србија и Црна Гора), дзяржава на Пд Еўропы, на Балканскім п-ве. На З мяжуе з Босніяй і Герцагавінай, Харватыяй, на Пн з Венгрыяй, на У з Румыніяй і Балгарыяй, на Пд з Македоніяй і Албаніяй; на ПдЗ абмываецца Адрыятычным морам. Пл. 102,35 тыс. км$^2$. Нас. 10 656 тыс. чал. (2002). Афіц. мова — сербская, выкарыстоўваецца албанская. Сталіца — г. *Бялград.* С. і Ч. — свабодная федэрацыя 2 рэспублік — *Сербіі* і *Чарнагорыі.* Захоўвае дзярж. сімволіку б. *Югаславіі.* У складзе Сербіі 2 аўт. краі — Ваяводзіна, Косава і Метохія.

**Гісторыя стварэння і дзяржаўнае ўладкаванне**. Супольніцтва пад назвай Сербія і Чарнагорыя (СіЧ) заканадаўча аформілася ў лют. 2003 на тэр. скасава-






най Саюзнай Рэспублікі Югаславія. Прыцыповае рашэнне аб гэтым прынята ў сак. 2002 на перагаворах у Бялградзе паміж прэзідэнтамі Югаславіі (В.Каштуніца) і Чарнагорыі (М.Джуканавіч), якія падпісалі «Зыходныя асновы перабудовы адносін Сербіі і Чарнагорыі» і Дагавор ад 14.3.2002 аб прынцыпах перабудовы адносін паміж *Сербіяй* і *Чарнагорыяй.* Дагавор ратыфікаваны парламентамі Сербіі і Чарнагорыі 9.4.2002. Чарнагорыя атрымала права праз 3 гады правесці рэферэндум аб поўнай дзярж. незалежнасці. 20.10.2002 у Чарнагорыі адбыліся датэрміновыя парламенцкія выбары, на якіх перамогу атрымала кааліцыя «Дэмакратычны спіс за еўрапейскую Чарнагорыю — М.Джуканавіч». 4.2.2003 Саюзная Скупшчына (парламент) Югаславіі прыняла Канстытуцыйную хартыю дзярж. супольніцтва СіЧ і закон аб яе прымяненні. Раней гэтыя дакументы прыняты ў скупшчынах Сербіі і Чарнагорыі. Усе органы ўлады Югаславіі скасаваны і замест іх створаны новыя. Сербія і Чарнагорыя — цалкам раўнапраўныя рэспублікі, сумесна выпрацоўваюць знешнюю і абаронную палітыку. Кожная з іх мае ўласныя валюты (дынар і еўра), унутр. рынкі і мытныя сістэмы. Паводле Канстытуцыйнай хартыі СіЧ мае наступныя сумесныя інстытуты ўлады: прэзідэнта, Скупшчыну, Савет Міністраў і суд. Ва ўрадзе 5 міністраў: замежных спраў, абароны, міжнар. эканам. адносін, унутр. эканам. адносін, па абароне правоў чалавека і нац. меншасцей. СіЧ не мае дзярж. бюджэту, валютных рэзерваў, міністэрства фінансаў, Цэнтрабанка. Саветам Міністраў кіруе прэзідэнт СіЧ (з сак. 2003 чарнагорац С.Маравіч), якога выбірае аднапалатная Скупшчына (старшыня — серб Д.Мічунавіч). 28.12.2003 у Сербіі адбыліся пазачарговыя парламенцкія выбары. Па іх выніках галоўны к-т Дэмакр. партыі Сербіі, якую ўзначальвае В.Каштуніца, даручыў яму сфарміраваць новы сербскі ўрад. У студз. 2004 другі прадстаўнік гэтай партыі Д.Маршычанін выбраны старшынёй новай Скупшчыны (парламента) Сербіі з адначасовым выкананнем абавязкаў прэзідэнта рэспублікі. Яго кандыдатуру пры пэўных умовах падтрымала Сацыяліст. партыя Сербіі, што дазволіла перадолець крызіс, які мог прывесці да новых парламенцкіх выбараў. СіЧ прызнана міжнар. супольнасцю. Яна — чл. ААН (заняла месца б. Югаславіі), Савета Еўропы (з крас 2003), інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў сак. 2003.

**Прырода**. Паўн. ч. Сербіі размешчана на паўд. ускраіне Сярэднедунайскай раўніны. Па правым беразе р. Сава і шыротным адрэзку ўздоўж р. Дунай распасціраюцца хрыбты і масівы Сербскага нагор'я і Усх.-Сербскіх гор, на Пд — Македонскае нагор'е з катлавінамі Косава Поле і Метохія. Паўд.-зах.

Рэпозиторий БГПУ

зе, хіміі нанаструктураваных матэрыялаў і іонна-імплантаваных палімераў, фотаэлектрахіміі квантава-размерных неарган. і малекулярных паўправаднікоў.

*Тв.*: Ion-implanted Polymers (разам з У.Б.Аджаевым, І.П.Казловым) // Electrical and Optical Polymer Systems. New York, 1927; Photoelectrochemistry of nanocrystalline aggregates of cyanine dyes on the semiconductor electrodes // Chemical Physics of Nanostructured Semiconductors. The Netherlands, 2003; Математическое моделирование физико-химических процессов. Мн., 2003 (разам з У.Р.Скацецкім, В.І.Яшкіным).

**СЕЛЯМЕ́НЕЎ** Вячаслаў Дзмітрыевіч (н. 6.9.1946, Мінск), бел. гісторык-архівіст. Канд. гіст. н. (1979). Скончыў БДУ (1971). З 1968 у Цэнтр. дзярж. архіве Кастр. рэвалюцыі і сацыяліст. будаўніцтва БССР, з 1977 у Гал. архіўным упраўленні пры СМ БССР, з 1980 нам. дырэктара Цэнтр. дзярж. архіва БССР у Мінску, з 1982 дырэктар Цэнтр. дзярж. архіва Кастр. рэвалюцыі і сацыяліст. будаўніцтва БССР (з 1995 Нац. архіў Рэспублікі Беларусь). Даследуе гісторыю Беларусі з 1917, пытанні архівазнаўства. Адзін з аўтараў кніг «Хроніка Чарнобыльскай трагедыі, 1986—1996 (па дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь)» (1996), «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь» (2002). Адзін са складальнікаў даведнікаў «Адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад БССР» (т. 1, 1985), «Фонды былых архіваў Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 1—2, 1997—98), зб. дакументаў і матэрыялаў «Беларускія остарбайтэры» (т. 1—3, 1996—98), «Азарычы — лагер смерці» (1997), «Нацысцкае золата з Беларусі» (1998), «Заходняя Беларусь. Падзеі і людзі» (т. 1—2, 1998—2002), «Аграрныя пераўтварэнні ў Вілейскай вобласці, 1939—1941 гг.» (2001), «Аграрныя пераўтварэнні ў Маладзечанскай вобласці, 1944—1953 гг.» (2003), «Дакументы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь» (2003). Дзярж. прэмія Беларусі 2002.

*Тв.*: Документальные памятники Советской Белоруссии. Мн., 1990 (разам з М.Ф.Шумейкам); Белпромстройбанк: Страницы истории (1923—1998) Мн., 1998 (разам з К.В.Цыбулькам, М.Е.Капытовым); Архивоведение Беларуси. Ч. 1—2. Мн., 1998 (разам з Шумейкам, К.І.Козакам); Белорусские остарбайтеры: Ист.-аналит. исслед. Мн., 2001 (у сааўт.); Забытые агенты Кремля (разам з В.І.Шымоліным). Мн., 2003.

**СЕМЯНКО́ВА** Галіна Мікалаеўна (н. 2.5.1952, Мінск), бел. вучоны ў галіне малекулярнай біялогіі. Канд. біял. н. (1989), дац. (2002). Скончыла БДУ (1973), дзе працуе з 1977. Навук. працы па вывучэнні механізмаў актывацыі клетак імуннай сістэмы, ролі актыўных форм кіслароду і азоту ў рэгуляцыі функцыян. актыўнасці клетак у норме і пры захворваннях, звязаных з парушэннем імунітэту. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

*Тв.*: Активные формы кислорода и функциональный отклик имунных клеток (разам з С.М.Чаранкевічам) // Фотобиология и мембранная биофизика. Мн., 1999; Investigation of G-CSF-influence on activity of neutrophils of healthy volunteers and oncohaematological patients by the chemiluminiscent method (у сааўт.) // Chemiluminescence at the turn of the milenium. Dresden, 2001. *А.Б.Самаль.*

**СЕН** Амарцья (н. 3.11.1933, Шанцініketан, Індыя), індыйскі эканаміст. Д-р эканам. н. (1959). Скончыў Калькуцкі і Кембрыджскі (1955) ун-ты. Выкладаў эканоміку ў ВНУ Індыі, Вялікабрытаніі і ЗША: у Джабалпурскім (1956—58), Дэлійскім (1963—71), Оксфардскім (1978—88 і з 1998) і Гарвардскім (1988—98) ун-тах, Лонданскай школе эканомікі (1971—77). У працы «Галеча і голад...» (1981) даследаваў фактары, якія вядуць да беспрацоўя і неэфектыўнасці сістэмы харч. размеркавання, выступае як прыхільнік дапамогі бедным і захавання стабільных цэн на прадукты харчавання. Нобелеўская прэмія па эканоміцы 1998.

*Тв.*: Рус. пер. — Развитие как свобода (отрывок из книги «Развитие как свобода») // Индия. Перспективы. 2000. № 1. *В.У.Адзярыха.*

**СЕ́РБІЯ І ЧАРНАГО́РЫЯ** (Србија и Црна Гора), дзяржава на Пд Еўропы, на Балканскім п-ве. На З мяжуе з Босніяй і Герцагавінай, Харватыяй, на Пн з Венгрыяй, на У з Румыніяй і Балгарыяй, на Пд з Македоніяй і Албаніяй; на ПдЗ абмываецца Адрыятычным морам. Пл. 102,35 тыс. км$^2$. Нас. 10 656 тыс. чал. (2002). Афіц. мова — сербская, выкарыстоўваецца албанская. Сталіца — г. *Бялград*. С. і Ч. — свабодная федэрацыя 2 рэспублік — *Сербіі* і *Чарнагорыі.* Захоўвае дзярж. сімволіку б. *Югаславіі.* У складзе Сербіі 2 аўт. краі — Ваяводзіна, Косава і Метохія.

**Гісторыя стварэння і дзяржаўнае уладкаванне**. Супольніцтва пад назвай Сербія і Чарнагорыя (СіЧ) заканадаўча аформілася ў лют. 2003 на тэр. скасаванай Саюзнай Рэспублікі Югаславія. Прыцыповае рашэнне аб гэтым прынята ў сак. 2002 на перагаворах у Бялградзе паміж прэзідэнтамі Югаславіі (В.Каштуніца) і Чарнагорыі (М.Джуканавіч), якія падпісалі «Зыходныя асновы перабудовы адносін Сербіі і Чарнагорыі» і Дагавор ад 14.3.2002 аб прынцыпах перабудовы адносін паміж *Сербіяй* і *Чарнагорыяй*. Дагавор ратыфікаваны парламентамі Сербіі і Чарнагорыі 9.4.2002. Чарнагорыя атрымала права праз 3 гады правесці рэферэндум аб поўнай дзярж. незалежнасці. 20.10.2002 у Чарнагорыі адбыліся датэрміновыя парламенцкія выбары, на якіх перамогу атрымала кааліцыя «Дэмакратычны спіс за еўрапейскую Чарнагорыю — М.Джуканавіч». 4.2.2003 Саюзная Скупшчына (парламент) Югаславіі прыняла Канстытуцыйную хартыю дзярж. супольніцтва СіЧ і закон аб яе прымяненні. Раней гэтыя дакументы прыняты ў скупшчынах Сербіі і Чарнагорыі. Усе органы ўлады Югаславіі скасаваны і замест іх створаны новыя. Сербія і Чарнагорыя — цалкам раўнапраўныя рэспублікі, сумесна выпрацоўваюць знешнюю і абаронную палітыку. Кожная з іх мае ўласныя валюты (дынар і еўра), унутр. рынкі і мытныя сістэмы. Паводле Канстытуцыйнай хартыі СіЧ мае наступныя сумесныя інстытуты ўлады: прэзідэнта, Скупшчыну, Савет Міністраў і суд. Ва ўрадзе 5 міністраў: замежных спраў, абароны, міжнар. эканам. адносін, унутр. эканам. адносін, па абароне правоў чалавека і нац. меншасцей. СіЧ не мае дзярж. бюджэту, валютных рэзерваў, міністэрства фінансаў, Цэнтрабанка. Саветам Міністраў кіруе прэзідэнт СіЧ (з сак. 2003 чарнагорац С.Маравіч), якога выбірае аднапалатная Скупшчына (старшыня — серб Д.Мічунавіч). 28.12.2003 у Сербіі адбыліся пазачарговыя парламенцкія выбары. Па іх выніках галоўны к-т Дэмакр. партыі Сербіі, якую ўзначальвае В.Каштуніца, даручыў яму сфарміраваць новы сербскі ўрад. У студз. 2004 другі прадстаўнік гэтай партыі Д.Маршычанін выбраны старшынёй новай Скупшчыны (парламента) Сербіі з адначасовым выкананнем абавязкаў прэзідэнта рэспублікі. Яго кандыдатуру пры пэўных умовах падтрымала Сацыяліст. партыя Сербіі, што дазволіла пераадолець крызіс, які мог прывесці да новых парламенцкіх выбараў. СіЧ прызнана міжнар. супольнасцю. Яна — чл. ААН (заняла месца б. Югаславіі), Савета Еўропы (з крас 2003), інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў сак. 2003.

**Прырода**. Паўн. ч. Сербіі размешчана на паўд. ускраіне Сярэднедунайскай раўніны. Па правым беразе р. Сава і шыротным адрэзку ўздоўж р. Дунай распасціраюцца хрыбты і масівы Сербскага нагор'я і Усх.-Сербскіх гор, на Пд — Македонскае нагор'е з катлавінамі Косава Поле і Метохія. Паўд.-зах.




Репозиторий БГПУ